ЗАЦВЯРДЖАЮ
дырэктар дзяржаўнай установы
культуры "Астравецкая раённая
бібліятэка"
______________________ Н.У.Ачарэтава
"27" снежня 2025 года

Праект
філіяла "Дзіцячая бібліятэка"
па рабоце з дзецьмі
з абмежаванымі магчымасцямі здароў'я
"Ты ў гэтым свеце не адзін"
на 2026 год

Астравец, 2026

## I. Абгрунтаванне праекта:

Дзеці ў Беларусі з'яўляюцца вялікай каштоўнасцю і прыярытэтнай для бібліятэк групай. Асаблівага падыхода ў гэтым плане патрабуюць дзеці з абмежаваным магчымасцямі здароўя, жыццё гэтых дзяцей ідзе ў складаных умовах, яно вельмі адрозніваецца ад вобраза жыцця і выхавання здаровых дзяцей.

Роля бібліятэкі ў жыцці асаблівых дзяцей вельмі важная. Для многіх з іх свет адкрываецца менавіта праз кнігу, якая заўсёды лічылася адным з сувязных звенняў паміж людзьмі пры перадачы жыццёвага вопыта. Кніга лечыць, падтрымлівае чытача, гарманізуе яго ўнутраны свет – і для такіх чытачоў бібліятэкі прадастаўляюць свае фонды.

Іншым дзецям, якія па шэрагу абставін не могуць чытаць самастойна і ўспрымаць прачытанае ўслых, бібліятэка дае магчымасць зносін з аднагодкамі і бібліятэкарамі. Прыцягвае іх да пасільнага ўдзелу ў разнастайных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў бібліятэцы, арганізоўвае мерапрыемствы спецыяльна для такіх дзетак. Гэта ў пэўнай ступені папаўняе дэфіцыт дабрыні, дапамагае дзецям змагацца з пачуццём адзіноты, непаўнацэннасці. Для сваіх асаблівых чытачоў бібліятэка імкнецца стварыць магчымасць для развіцця, задавальнення іх духоўных і пазнавальных запатрабаванняў.

Бібліятэка як сацыяльны інстытут на сучасным этапе прызвана арганізоўваць умовы для бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, садзейнічае іх адукацыйнаму працэсу, творчаму і духоўнаму развіццю асобы, садзейнічае працэсу інтэграцыі гэтых дзяцей у грамадстве, забяспечвае атрыманне неабходнай інфармацыі ў розных галінах ведаў.

Адным з найбольш актуальных накірункаў праекта з'яўляецца рэабілітацыя дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

У час рэалізацыі праекта з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя будуць выкарыстоўвацца разнастайныя формы работы, гульнёвыя праграмы, конкурсы, майстар-класы, экскурсіі і інш.

## II. Мэта праекта:

Сацыяльная адаптацыя дзяцей-інвалідаў у сучасным грамадстве, садзейнічанне гарманічнаму развіццю асобы дзіцяці.

## III. Задачы праекта:

1. Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя;
2. Стварэнне ўмоў для развіцця духоўных і пазнавальных патрэб асаблівых дзяцей;
3. Прадастаўленне асаблівым дзецям магчымасці зносін з аднагодкамі;

4. Пошук новых форм і метадаў у рабоце з асаблівымі дзецьмі і іх бацькамі.

## IV. Партнёры бібліятэкі ў рэалізацыі праекта:

Карэкцыйныя 1-9 класы Астравецкага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

## V. Асноўныя мерапрыемствы:

| № п/п | Назва і форма мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1 | "В гостях у снежной зимы": майстар-клас па вырабу сняжынкі | студзень | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 2 | "Лесные жители. Путешествие по лесу": гульнёвая праграма | люты | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 3 | "Весеннее пробуждение": майстар –клас па вырабу паштоўкі для маці (да Міжнарожднага дня 8 сакавіка) | сакавік | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 4 | "Космическое путешествие": квэст-гульня | красавік | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Саколоўская |
| 5 | "В мире книжных чудес": калейдаскоп | май | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 6 | "Жывуць на планеце шчаслівыя дзеці": гульнёвая праграма (да Дня абароны дзяцей) | чэрвень | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 7 | "Весёлый школьный звонок": майстар-клас па вырабу закладкі для кнігі (званок і банцік) | верасень | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 8 | "Мамины помощники": майстар-клас па вырабу паштоўкі-далонькі | кастрычнік | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 9 | "Морские приключения": гульня-падарожжа | лістапад | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |
| 10 | "Волшебный мир зимних историй": гульнёвая праграма (да Міжнароднага дня інвалідаў) | снежань | В.Б.Мундуць<br>Л.М.Сакалоўская |

Загадчык філіяла "Дзіцячая бібліятэка" В.Б.Мундуць

Дырэктар Астравецкага РЦКРНіР А.Д.Авлас